# Баявыя задачы нашай моладзі

**(З выступлення сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Зіманіна на нарадзе брыгадзіраў комсамольска-маладзёжных брыгад)**

З вялікім палітычным і працоўным уздымам узяўся беларускі народ за аднаўленне народнай гаспадаркі, па-варварску разбуранай нямецка-фашысцкімі акупантамі. Нямалая роля ў гэтай творчай рабоце належыць комсамолу і несаюзнай моладзі Беларусі, якія з першых дзён прыходу Чырвонай Арміі разам з усімі рабочымі, інжынерна-тэхнічнымі работнікамі і калгаснікамі нашай рэспублікі ўзяліся за аднаўленне фабрык, заводаў, калгасаў і соўгасаў. Яркім сведчаннем высокай свядомасці, актыўнасці і жадання хутчэй аднавіць разбураную гаспадарку з'яўляецца стварэнне комсамольска-маладзёжных брыгад ў прамысловасці, на транспарце, на нашых будоўлях, маладзёжных звенняў — у калгасах і соўгасах.

На прадпрыемствах вызваленых раёнаў Беларускай рэспублікі створана 735 комсамольска-маладзёжных брыгад, якія аб'ядноўваюць 13.755 комсамольцаў і несаюзнай моладзі, занятых у розных галінах прамысловасці.

Выдатныя ўзоры работы паказалі комсамольска - маладзёжныя брыгады лясной прамысловасці Беларусі. У социялістычным спаборніцтве маладых лесарубаў і возчыкаў удзельнічала 236 маладзёжных брыгад з ахопам 5.000 комсамольцаў і моладзі. Многія з іх дасягнулі выдатных паказальнікаў. Брыгада Марыі Тагай (Хойніцкі леспрамгас), з 9 чалавек, нарыхтавала 1.050 кубаметраў лесу, выканаўшы план на 233 процанты. Брыгада ўзнагароджана ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ і атрымала 3-ю прэмію ва ўсесаюзным социялістычным спаборніцтве. Маладыя лесарубы Чэрыкаўскага леспрамгаса (брыгадзір Фёдар Палякоў) сістэматычна выконвалі сваё заданне на 180 процантаў, Параўлянскага леспрамгаса (брыгадзір тав. Бандарэнка)—на 171 процант і г. д. Брыгада тав. Фаенка Анастасіі (Касцюковіцкі леспрамгас) за выдатную работу атрымала пераходны сцяг ЦК ЛКСМБ і Наркамлеса БССР.

Маладыя рабочыя працавалі ў лесе напружана, не шкадуючы сіл і энергіі. Характэрна, што значную частку гэтых брыгад складалі дзяўчаты, многія з якіх упершыню прыйшлі на лесазаготоўкі.

Добрых паказальнікаў дасягнулі і комсамольска - маладзёжныя брыгады Гомеля, якія актыўна ўдзельнічаюць у аднаўленні прадпрыемстваў. У Гомелі—64 комсамольска-маладзёжныя брыгады, з іх 26 жаночых. Усе яны, як правіла, перавыконваюць вытворчыя заданні. Вось некалькі прыкладаў. На заводзе, дзе дырэктарам тав. Калешка, 8 комсамольска-маладзёжных брыгад, тром з якіх прысвоена званне франтавых. Брыгада тав. Куксіна атрымала заданне выканаць адну важную работу за 15 дзён. Заданне было выканана за 11 дзён на 160 процантаў, прычым колькасць членаў брыгады скарочана з 17 да 8 чалавек. Добрых паказальнікаў брыгада дабілася дзякуючы правільнай расстаноўцы рабочай сілы і правільнай арганізацыі працы. Заданне на наступны дзень брыгада атрымлівае ў канцы работы, інструмент раздаецца да пачатку работ.

Франтавая брыгада мантажнікаў Н-скай электрастанцыі, якую ўзначальвае тав. Лабанаў, працуючы на рамонце электраматораў, датэрмінова змантыравала адзін аб'ект. Сярэдняя норма выпрацоўкі брыгады—220 процантаў. Комсамольска - маладзёжная брыгада, дзе брыгадзірам тав. Нядзельскі, першая на заводу атрымала заданне асвоіць выпуск новых відаў ліхтароў. Брыгада датэрмінова выканала заданне, скараціўшы лік членаў брыгады на 5 чалавек.

Трэба адзначыць добрую работу комсамольска - маладзёжных брыгад Беларускай чыгункі, якія спалучаюць выдатную работу па дастаўцы грузаў да лініі фронта з аднаўленнем чыгуначнай гаспадаркі, па-варварску разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Прыклад самаадданай працы паказала брыгада тав. Фядорынай, якая, працуючы на мантажы сувязі, здолела вызваліць трох чалавек для работы на суседніх участках і сістэматычна выконвае вытворчае заданне на 615 процантаў. Больш таго, брыгада адрамантавала і прывяла ў парадак у пазарабочы час жыллёвы дом, з'явіўшыся, такім чынам, адным з зачынал чаркасаўскага руху ў Гомелі.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі